ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 32 (554) | Субота, 12 лістапада 1983 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

Учора ў галоўным корпусе ГДУ адбылася навукова-практычная канферэнцыя «Праблемы ўдасканальвання кіравання прамысловым прадпрыемствам». Яе падрыхтавалі і правялі Міністэрства машынабудавання для лёгкай і харчовай прамысловасці і бытавых прыбораў СССР, Цэнтральнае праектна-канструктарскае тэхналагічнае бюро навуковай арганізацыі працы і аўтаматызаваных сістэм кіравання «Сістэмпраект» і Гомельскі дзяржаўны універсітэт. На канферэнцыю было прадстаўлена каля ста навуковых дакладаў, у якіх разглядаюцца пытанні ўдасканальвання арганізацыі працы, яе брыгадных форм, павышэння якасці прадукцыі, укаранення і развіцця аўтаматызаваных сістэм кіравання вытворчасцю, павышэння эфектыўнасці сацыялістычнага спаборніцтва, эканоміі энергетычных і сыравінных рэсурсаў і інш. Аўтарамі дакладаў, тэзісы якіх выпушчаны асобным выданнем, з'яўляюцца вучоныя і супрацоўнікі Акадэміі народнай гаспадаркі пры Савеце Міністраў СССР, 12 дзяржаўных універсітэтаў і многіх іншых вышэйшых навучальных устаноў краіны, некаторых саюзных і рэспубліканскіх навукова-даследчых інстытутаў эканамічнага профілю, вядучыя спецыялісты прамысловых прадпрыемстваў.

Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі дазволяць яе ўдзельнікам больш плённа працаваць над вырашэннем абмеркаванай праблемы.

## У СВЯТОЧНЫХ КАЛОНАХ

Яркай чырванню сцягоў і транспарантаў быў расквечан наш родны Гомель 7-га лістапада. Як і па ўсёй неабсяжнай краіне, выйшлі рабочыя прадпрыемстваў, інтэлігенцыя, моладзь на святочную дэманстрацыю, прысвечаную 66-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Яны прайшлі ў святочных калонах дэманстрантаў, яшчэ раз прадэманстраваўшы сваю згуртаванасць вакол роднай Камуністычнай партыі, гатоўнасць пад яе мудрым кіраўніцтвам ісці да новых перамог у камуністычным будаўніцтве, сваёй самаадданай працай мацаваць абароназдольнасць нашай краіны.

Са святочным, прыўзнятым настроем ішлі ў калонах дэманстрантаў працоўных г. Гомеля выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты нашага універсітэта. Яны рапартавалі партыі, Радзіме аб сваіх поспехах і дасягненнях у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, здабытках у час трэцяга працоўнага семестра-83.






На здымках: калоны ГДУ — на святочнай дэманстрацыі.

Фота М. Высоцкага.

## ВУЧЫМСЯ ВУЧЫЦЦА



«В науке нет широкой столбовой дороги, и только тот может достичь её сияющих вершин, кто, не страшась усталости, карабкается по её каменистым тропам». Гэта выказванне К. Маркса поўнасцю адпавядае тым патрабаванням і задачам, якія пастаўлены перад намі, студэнтамі. Мы імкнемся авалодаць ведамі, атрымаць вышэйшую адукацыю, каб пасля заканчэння універсітэта вучыць і выхоўваць падрастаючае пакаленне. Для ажыццяўлення гэтага высакароднага імкнення трэба ўмець вучыцца правільна арганізаваць самастойную вучэбную работу.

Гэтаму служыць спецкурс па асновах пазнавальнай дзейнасці, прачытаны нам у пачатку навучальнага года дацэнтам кафедры педагогікі і псіхалогіі А. В Саннікавай. На лекцыях і ў працэсе дамашняй работы па пытаннях спецкурса мы вывучаем заканамернасці пазнавальнай дзейнасці і практыкі па авалодванню матэрыялам. Мы даведаліся, як трэба рыхтавацца да лекцыйных заняткаў, засвойваць вучэбны матэрыял, якія ёсць прыёмы яго запамінання і інш.

Заключным этапам работы па спецкурсу было правядзенне канферэнцыі на тэму «Агульныя асновы актывізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў». У час падрыхтоўкі да яе мы вывучылі матэрыял лекцый, дадатковую літаратуру, рыхтавалі рэфераты на тэмы: «Пазнавальная дзейнасць студэнтаў па авалодванню лекцыйным матэрыялам», «Як працаваць з першакрыніцамі», «Аб культуры разумовай працы» і інш.

На канферэнцыі разглядаліся пытанні, якія асабліва хвалююць першакурснікаў. З цікаўнасцю ўспрымаліся даклады: «Як правільна засвоіць матэрыял лекцый?», «Як чаргаваць рабочы і вольны час?» Вялікае ажыўленне і актыўны абмен думкамі выклікалі пытанні арганізацыі самастойнай работы, рэжым дня студэнтаў, якія займаюцца ў другую змену.

Цікавасць студэнтаў да абмяркоўваемых пытанняў тлумачыцца тым, што выступаючыя студэнткі Л. Леўшунова, А. Аканішнікава, А. Савіцкая супастаўлялі веды, атрыманыя на лекцыях па спецкурсу і ў выніку самастойнага вывучэння рэкамендаванай літаратуры, са сваімі індывідуальнымі стэрэатыпамі вучэбнай работы.

Для нас, першакурснікаў, гэты спецкурс і канферэнцыя прынеслі вялікую карысць. Мы будзем старацца выкарыстоўваць усе заканамернасці пазнавальнай дзейнасці, каб авалодаць ведамі на ўзроўні сучасных патрабаванняў.

А. ЗАЙЦАВА,
А. БУРАКЕВІЧ,
першакурснікі гістфіка.

НА ЗДЫМКУ: у час правядзення канферэнцыі.

## ТАЛЕНТЫ ПЕРШАКУРСНІКАЎ

Прайшоў агульнауніверсітэцкі агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці «Ану, першакурснік!» Усе з нецярпімасцю чакалі яго, старанна рыхтаваліся. Жадаючых паглядзець і паслухаць новыя універсітэцкія таленты было так многа, што іх не магла нават умясціць актавая зала ГДУ. На працягу некалькіх гадзін гучалі са сцэны музыка і песні, вершы, у імклівым і агністым танцы кружыліся ўдзельнікі агляду талентаў. Дружнымі і гарачымі апладысментамі сустракалі выступленні першакурснікаў гледачы.

І вось конкурс «Ану, першакурснік!» завяршыўся. Падведзены яго вынікі. Эканамічны і гісторыка-філалагічны факультэты прадставілі на суд журы і гледачоў самыя цікавыя і змястоўныя праграмы. Яны былі да канца вытрыманымі па сваёй ідэйнай накіраванасці, прысвячаліся 40-годдзю вызвалення г. Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аддаючы даніну глыбокай павагі загіўнушым у гады Вялікай Айчыннай вайны воінам, усе прысутныя ў актавай зале ўшанавалі іх памяць мінутай маўчання. Пранікнёна прагучалі песні «Ішоў салдат» і «Песня аб Гомелі» у выкананні хору першакурснікаў гісторыка-філалагічнага факультэта. Спадабалася ўсім і выкананая першакурсніцай эканамічнага факультэта С. Рабянок песня «На плячы тваім». Журы не магло аддаць перавагу ніводнаму з названых факультэтаў, і ў выніку гістфіл і эканомфак падзялілі паміж сабой першае месца.

Ні ў якое параўнанне не ішло выступленне першакурснікаў біялагічнага факультэта сёлетняга года ў адрозненне ад мінулагодняга конкурсу. Відаць, на факультэце зрабілі адпаведныя вывады і аднесліся да падрыхтоўкі праграмы выступлення самым сур'ёзным чынам. Адсюль і добрыя вынікі — другое месца біяфака ў конкурсе. Цёпла сустрэла зала песні «Цёмная ноч», «Жураўлі», «Гэты вечар» і іншыя ў выкананні будучых біёлагаў.

Трэцяе месца ў конкурсе «Ану, першакурснік!» занялі студэнты матэматычнага факультэта. Асабліва добра ўспрыймаліся членамі журы і гледачамі прадстаўленыя на конкурс танцы.

Напоўненай вясёлым і трапным студэнцкім гумарам была праграма першакурснікаў фізічнага факультэта. Прыўзнімала настрой, выклікала шчыры смех выступленне канферанс'е фізікаў. Журы прысудзіла фізфаку чацвёртае месца.

Геафак і факультэт фізічнага выхавання паказалі слабыя праграмы, якія не адпавядалі патрабаванням конкурсу. Іх ідэйны ўзровень быў нізкім, таму не дзіўна, што гэтыя факультэты наогул не занялі ніякіх месц. Застаецца пажадаць іх камсамольскім бюро больш сур'ёзна адносіцца да мастацкай самадзейнасці на сваіх факультэтах, «хварэць» душой за іх гонар.

Асобныя ўдзельнікі конкурсу былі адзначаны журы і ўзнагароджаны граматамі. Гэта А. Лішык і С. Рабянок з эканамічнага факультэта, А. Аўдашова, Г. Кавалёў з біяфака, выканаўцы бальных танцаў Н. Нячай і Л. Якшынскі (фізічны факультэт), першакурснік гісторыка-філалагічнага факультэта А. Іваноў.

Добрае выканаўчае майстэрства паказалі на конкурсе таксама Т. Святлічная з фізічнага факультэта, Т. Вараб'ёва (біяфак), Т. Рыбакова (факультэт фізвыхавання), Г. Кізіцкая (матэматычны факультэт).

Юнакі і дзяўчаты, якія паспяхова выступілі ў конкурсе «Ану, першакурснік!», могуць развіваць свае таленты, удасканальваць выканаўчае майстэрства ў калектывах мастацкай самадзейнасці, якія працуюць пры студэнцкім клубе ГДУ «Маладосць».

І. НЕШЫК,
студэнтка эканамічнага факультэта, адказная за прэс-цэнтр.

